**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка”**

Факультэт беларускай філалогіі і культуры

Кафедра беларускага мовазнаўства

**Пушкарова**

**Наталля Сяргееўна**

# Аказіяналізмы ў творчасці Валянціны Аколавай

**Дыпломнае даследаванне**

**Навуковы кіраўнік –**

**кандыдат філалагічных навук,**

**дацэнт Нямковіч Н. М.**

**Мінск, 2010**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Рэзюмэ

Пушкарова Наталля Сяргееўна

**Аказіяналізмы ў творчасці Валянціны Аколавай**

**Ключавыя словы**: аказіянальнае слова, аказіяналізм, дэрыват, наватвор, словаўтваральны тып, словаўтваральная мадэль, словаўтваральны фармант, семантыка, стылістычная функцыя, ацэначнасць, фальклорнае слова.

**Аб'ект даследавання** – аказіянальная лексіка В. Аколавай.

**Прадмет даследавання** – семантыка, словаўтваральная структура, стылістычныя функцыі аказіянальных слоў.

**Мэта даследавання** – паказаць адметнасць аказіянальнай лексікі як стылеўтваральнага сродку ў творчасці Валянціны Аколавай.

**Метады даследавання** – апісальны, статыстычны, супастаўляльны.

**Навуковая навізна атрыманых вынікаў** заключаецца ў паглыбленні і ўдакладненні шэрагу тэарэтычных уяўленняў аб аказіянальных словах. Вынікі гэтай работы садзейнічаюць выяўленню шляхоў утварэння неузуальных слоў, дэманструюць магчымасці словаўтваральнай сістэмы беларускай мовы. Навуковая значнасць працы заключаецца ў шматаспектным падыходзе да аналізу і апісання аказіянальнай лексікі В. Аколавай.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў**. Асноўныя назіранні, праведзеныя ў працы, і практычны матэрыял знойдуць сваё прымяненне пры напісанні падручнікаў, лінгвістычных даведнікаў па дэрывацыі, пры складанні слоўнікаў аказіяналізмаў. Матэрыялы даследавання будуць карысныя пры чытанні курсаў "Сучасная беларуская літаратурная мова", "Стылістыка беларускай мовы", распрацоўцы спецкурсаў, правядзенні спецсемінараў, пры напісанні курсавых і дыпломных прац студэнтамі ВНУ Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ